вітала вызваліцеляў з *усходу*. Каб радасьць была яшчэ мацнейшаю, *усходнікі*, што цалаваліся на плякатах з заходнебеларускімі братамі, не скідалі каскаў ды моцна трымалі вінтоўкі.

# Футбол

***Віталь Цыганкоў***

*Футбол* і палітыка — дзьве рэчы, у якіх разьбіраюцца ўсе бяз вынятку. *Футбалістаў*, як і палітыкаў, зацята крытыкуюць людзі, якія самі ня могуць, вобразна кажучы, патрапіць па мячы. „Ты куды б'еш?", „Ну што гэта за пас?" і гэтак далей.

Па-ангельску *foot* — нага, а *ball* — мяч. *Футбол* быў і застаецца ў Беларусі самым масавым і папулярным відам спорту, хоць тут у нас няма такіх выдатных посьпехаў, як, напрыклад, у гандболе, цяжкай атлетыцы ці гімнастыцы. Дый беларускія заўзятары ніколі не вылучаліся такой адданасьцю і фанатызмам, як грузінскія альбо ўкраінскія. Нават у 1982 годзе трыбуны сталічнага стадыёну „Дынама" не былі запоўненыя, хоць у тым годзе менскае „Дынама" стала чэмпіёнам СССР.

У сярэдзіне 80-ых міліцыянты на стадыёне адбіралі ў маладых людзей бэасэсэраўскія сьцягі, як цяпер адбіраюць бел-чырвона-белыя. Беларуская міліцыя ўвогуле вылучалася нейкай асабліва тыповай для беларусаў строгасьцю. Міліцыянт мог — на стадыёне! — зрабіць заўвагу альбо нават затрымаць заўзятараў, якія, на ягоную думку, занадта горача выяўлялі свае эмоцыі.

У пачатку 90-ых у юных фанатаў, далёкіх ад нацыяналізму пэтэвэшнікаў і школьнікаў, галоўным поклічам стала „Жыве Беларусь!", якое яны пачалі скандаваць замест „Дынама—Мінск". А галоўным і, на жаль, адзінкавым зорным часам беларускага *футболу* можна назваць перамогу нацыянальнай зборнай над чарадзеямі гэтай гульні галяндцамі — адзін-нуль. Зрэшты, я ж казаў: кожны думае, што ён разьбіраецца ў *футболе* і палітыцы...

# Фуфайка

***Антаніна Хатэнка***

Некалі па заходнебеларускіх вёсках кабеты фарсілі ў плюшавіках, аздобленых футравымі манто.

Шляхетна плыла мая матуля па вуліцы — як пава. А на стрэчу ёй — гэткія ж упэўненыя, годныя сялянкі-пані. І нікому было няўцям, што найлепей маладзіцы й дзецюку, на думку новай улады, пасуе *фуфайка*. Гэткая цёплая, зручная, без фасонаў і выкрутасаў, — аднолькавая на ўсіх *фуфайка*. Апранаха, што вызваляе ад комплексаў і прэтэнзіяў. Унівэрсальная прыдумка новага ладу.

Здаецца, не засталося па вёсках і мястэчках людзіны, што ня ўлезла б, як у ракавіну, у *фуфайку*. У *фуфайцы* настаўнік або аграном — ужо не гнілая інтэлігенцыя, а паўнапраўны „член обшчаства". *Фуфайка* — як візытоўка ў „сьветлае будушчае"...

*Фуфайка* ганарыста ўскараскалася нават на дзіцячыя плечы. Нібыта прырасла да беларускае нацыянальнае паставы. І ўрэшце — відочна стала праяваю нашае маўклівае пакоры. *Фуфайка* дзе трэба — прыгорбіла, дзе належыць — прыхавала гордасьць стану.